




# Секцыя 4

# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КЛАСІКА

*Святлана Крылова (Мінск, Беларусь)*

## МІФАЛАГЕМА ДОЛІ Ў ЛІРЫЦЫ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выкарыстанне міфалагічнай спадчыны стала свядомым ідэйна-мастацкім прынцыпам у творчасці Янкі Купалы, што тлумачыцца паглыбленнем у беларускай літаратуры пач.ХХ ст. асноў народнасці, развіццём гістарызму мастацкага мыслення, характарызуецца ростам філасофска-эстэтычнай якасці мастацкіх твораў, імкненнем глыбей адлюстраваць духоўны свет асобы. “Гэты працэс азначаў развіццё паэтычнага арсеналу літаратуры, што суправаджалася непазбежна ўзмацненнем сімвалічных форм паэтычнай мовы, паглыбленнем літаратурнай міфалагізацыі вобразнага мыслення” [1, 127].

Купала звяртаўся да мінуўшчыны, выкарыстоўваючы ў сваіх творах міфалагічныя і фалькорныя матывы, вобразы не толькі дзеля паэтызацыі аблічча роднага краю або яго даўніны, але і дзеля вырашэння важных праблем сацыяльна-грамадскага жыцця. Паэт інстынктыўна адчуваў сілу слова, здольнасць мастацва перарабіць жыццё. І. Навуменка слушна адзначаў, што “па характары таленту Купала – паэт маштабнага мыслення, струны яго душы найбольш чуйна адгукаліся на ўсё вялікае, значнае, яркае і выключнае ў жыцці” [3, 128]. Шырока і мэтанікіравана выкарыстоўваючы міфалогію і фальклор, Янка Купала ўлічваў вопыт іншых славянскіх літаратур, асабліва рускай і польскай. У дарэвалюцыйнай творчасці паэта можна знайсці паралелі з некаторымі творамі Л. Андрэева, С. Пшэбышэўскага, С. Выспянскага, якія таксама нярэдка творча пераасэнсоўвалі міфалагічныя вобразы і сюжэты. Можна здзіўляцца, як глыбока адчуваў паэт міфалагічна-філасофскі патэнцыял перш за ўсё сваёй нацыянальнай культурнай спадчыны, як настойліва пракладваў ён шляхі эстэтычнага яднання нацыянальнай творчасці з сусветнай мастацкай культурай.

Часта паэт парушаў кананічную нязменнасць традыцыйных сюжэтаў і вобразаў згодна з уласнымі творчымі задачамі, пераасэнсоўваў міфалагічныя вобразы і матывы, надаваў ім дастатковае

сэнсавае напаўненне, што можна прасачыць на прыкладзе шматграннай аўтарскай семантызацыі міфалагемы Долі.

Чалавек здаўна адчуваў залежнасць свайго лёсу ад Вышэйшай сілы, якую ён персаніфікаваў у розныя канкрэтныя вобразы. Захаваліся цьмяныя ўяўленні народа пра ўвасабленне Долі і Нядолі. Калі чалавек не паладзіў са сваёй Доляй, добрым духам-ахоўнікам, на яго тут жа навальвалася Нядоля, і тады ўжо неабходны вялікія намаганні, каб яе пазбавіцца.

Вобразы Долі і Нядолі часта сустракаюцца ў творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Цёткі. У паэзіі Янкі Купалы Доля і звязаныя з ёю вобразы займаюць цэнтральнае месца, утвараючы ядро сацыяльна-філасофскай канцэпцыі паэта. Сам Янка Купала адзначаў значнасць гэтага вобраза: *Я ў долю народа свайго ўзіраюся / І толькі аб гэтым для вас я пяю* [3, I, 119].

Шэраг вершаў сведчыць не толькі аб важнасці тэмы Долі для Янкі Купалы, але і аб імкненні паэта па-новаму раскрыць яе: «З песень нядолі», «Доля удавы», «Аб мужыцкай долі», «Мая доля» і г.д.

Спасціжэнне глыбінь народнага жыцця, развагі аб будучым роднага краю – усё гэта сведчыць аб далейшым развіцці вобраза Долі, які падаецца не як статычны вобраз, а ва ўсім багацці жывога паэтычнага руху. Ствараючы свой вобраз Долі, Янка Купала творча пераасэнсоўвае традыцыі беларускай фальклорнай спадчыны. Вобраз Долі дапамагае паэту поўна раскрыць аўтарскую пазіцыю ў пытаннях быцця, сцвердзіць права беларускага народа змагацца з усім тым, што складае паняцце “нядоля”: прыгон, бяда, ліха, гора, крыўда, сум, слёзы, стогн, холад, голад і г.д.: *Эх, праклятая доля мая, / Ненавісна служба – прыгон! / Смокча кроў з мяне пан, як змяя, / Ды йшчэ грозіць, што выганіць вон* [3, I, 117].

Нядоля звязваецца ў Купалы і з бяспраўем, прыгнечаннем народа. Нездарма ў *“снах неспакойных, нядолі поўных”* ён бачыць *“бяздольнае… бязвольнае над сваёй будучай зямлёю”.*

Трэба адзначыць, што слова “доля” ў творах паэта не заўсёды роўнае самому сабе, не заўсёды абазначае адно і тое ж паняцце. Яно можа быць антонімам, калі скарыстоўваецца ў розных кантэкстах.

“Доля”, як нейтральнае паняцце, найчасцей выкарыстоўваецца паэтам для абазначэння спрадвечна справядлівага ўладкавання свету. Гэтай долі чалавек годны ўжо самім фактам свайго быцця, але яе ў яго няма. Матыў гібелі долі спалучае нацыянальную праблему з агульначалавечымі – *“доля акалела”*, прапала, *“доля бедняка сном вячыстым спіць”,* а таму і людзі ўжо як бы нараджаюцца бяздольнымі:

*Нарадзіўся на долю-нядолю / Чалавек на багатым свеце* [3, II, 158]. Або: *Дый, знаць, гаротным бяздольнае / Суджана з роду, з калыскі* [4, I, 30].

Намаганні знайсці долю дарэмныя, так бяздольнымі людзі і паміраюць: *Блудзіла сіротка па полі, / Блудзіла, шукаючы долі, / якой яна зроду не мела. / І дарма бядачка хадзіла, – / Забрала сіротку магіла: / так долі пабачыць не успела* [3, I, 101].

Доля можа сама аставіць бедняка, ідзе ад яго, *"доля няшчаснага ў полі бадзяецца"*. Распрацоўваючы фальклорныя матывы ("доля ў полі", "пошукі долі"), Янка Купала выказвае спадзяванні, што чалавек сам сабе здабудзе долю: *Бач, можа, і долю ў няўродлівым полі ты выарэш, братка, сабе* [3, II, 9].

Слова "доля" ў паэтычнай структуры набывае і значэнне "рэальная доля", якая мысліцца ўжо як "нядоля": *У курную хату, на яве ці ў сне, / Доля-нядоля прынсела мяне, / З доляй змагацца з сіл выбіўся я, / Эх ты, магілка, эх, дзе ты, мая* – [3, III, 158].

І гэта рэальная "доля-нядоля" персаніфікуецца, набывае рысы дэманічнай, злой істоты: *"праклятая доля", "чорная доля",* яна *"страшна", "зводзіць надзеі", "смуткам аплятае". "Злая доля змагла і мой край, і людзей", "мучаць нас чорныя долі, стогнем пад царом, стогнем пад панам"* («З песень мужычых»).

З другога боку, доля – гэта і будучае, імкненне да якога праяўляецца ў вобразах волі, праўды, шчасця, надзеі, веры, вясны, сонца, зорак, песень, навукі, працы і г.д. Гэта доля-мара, якая здабываецца людзьмі ў цяжкай барацьбе, яна супрацьпастаўляецца долі міфічнай. І гэтая будучая, новая доля па свайму дзеянню часта параўноўваецца з праявамі светлых касмічных сіл – сонца, зорак, маланкі: *Дык наперад, покі сэрца / Б'ецца, рвецца на прастор, Годзе млеці ў паняверцы! / Гэй, да сонца! Гэй, да зор!* [3, III, 11].

Дуалізм вобраза Долі (доля-гора, доля-шчасце) у паэтычнай сістэме Янкі Купалы заснаваны на дуалізме міфалагічнага мыслення, для якога жыццё разумелася як барацьба дзьвух сіл – светлай і цёмнай, Белага бога і Чорнага бога.

Выкарыстанне слова "бог" у паэзіі Янкі Купалы роўна па значэнню, якое яно мела ў праслявянскай мове: доля, частка, удзел. Як надзяляючы доляй, выступае ён (бог) і ў народных песнях, і ў вершах Янкі Купалы. Параўнаем: *"Да было ж, маці, у бога долі прасіці" – "Ад свету, ад бога жадаю нямнога… крыху долі, волі"* [3, I, 162]. Аднак, разам з тым, у вершах Купалы няма пакоры перад горкім лёсам. Бог, "цар неба і зямлі", на думку паэта, не можа даць долю мужыку: *Мальбы няшчасных: долі, праўды, хлеба ! /Ты глух паняць, пасланць маланкі бур* [3, III, 87].

У той жа час доля-нядоля, “станогае Ліха-Нядоля” ўяўляецца ўсемагутнай істотай, якая “не мае канца і пачатку, не знае граніцы і меры”. “Станогае Ліха-Нядоля” настолькі магутнае, што чалавек бяссільны перад ім. Яго нельга ўтапіць, зарэзаць, закапаць. Яно і *“не гіне ад кос і сякераў”.* Паэт імкнецца паказаць нам, што рэальнае зло, суаднесенае са злом вечным, выяўленым у міфалагічных вобразах “цемнатвораў”, “чорнага бога”, “станогага Ліха-Нядолі”, у каторага *“вочы... што ў начніцы”, “рукі – чараўніцы”,* погляд нараджае *“крыўду сляпую”,* прадстае перад яго няўмольным судом.

Улада “цемнатвораў” звязана са сном, які яны самі і наганяюць*: У вечным бары цемнатворы/ Скачуць, плачуць, весяляцца; / Жнуць, збіраюць дзіва-жніва/ У сонным полі, у горкай долі* [3, III, 54].

Але ўлада Чорнага бога ўяўляецца паэту ілюзорнай, часовай: *Паланейся, развугляйся / Змейны чорны бог, – /Ты йшчэ з белым не зраўняўся, / Ты мо не змог!..* [3, II, 87].

І таму паэт верыць у перамогу справядлівасці: *“запануе доля ў бедным людзе”.*

Вобраз Долі з’яўляецца асноўным для вырашэння такіх праблем, як паэт і паэзія, паэт і народ, паэт і гісторыя, будучае радзімы.

Паэт адчувае сябе такім жа “бяздольным”, як і ўвесь беларускі народ: *Доляй убогі, ён ціхі, нясмелы, / Бяда, яго маці, узгадавала, Слёзы пагарды п’е толькі век цэлы, / От, ведама, просты Янка Купала* [3, I, 170].

Аб непарыўнасці з народам, аб адзінстве шляхоў шукання долі лепшай Купала гаворыць у сваіх вершах як адкрыта, прама, так і апасродкавана. Напрыклад: *Шчасце так рэдка над светам усходзе: / Усе ж досыць бывае меці хоць мала, – / Долю каб бачыў у родным народзе, / А быў бы шчаслівы Янка Купала* [3, I, 170].

Або другі прыклад, у якім відавочна трансфармацыя фальклорнага сюжэту, дзе паэт уключае сябе ў якасці суб’екта ў аповед пра бедняка і яго горкай долі («Мая доля»). Цяжкая доля ходзіць *“як нябожчыка цень”,* ад яе жыццё нямілае. Лірычны герой пытаецца ў сваёй долі: *Чаму ж горкая такая, / Смерць мне лепей не пашлеш* – [3, I, 113].

Але свай прадвызначэнне Купала бачыць не ў тым, каб раздзяліць з народам яго лёс, а ў тым, каб зваць яго да лепшай долі: *Мы плачам, змучаныя доляй, / Над хмарай толькі сваіх бед, / Пясняр жа зрэнкаю саколяй/ Увесь аблятае белы свет, / І за ўсіх выцерпіць найболей, / І звяне, як той увосень цвет* [3, I, 121].

Т.І. Шамякіна піша: “Трагізм светаадчування Я. Купалы тлумачыцца не толькі горкім усведамленнем цяжкага лёсу сваёй Радзімы і народа, але і агульным адчуваннем нестабільнасці часу, прадбачаннем

страшных гістарычных катаклізмаў, адсутнасцю асабістага прытулку…” [4, 116].

Купала – паэт мужыцкай нядолі – усе ж такі глыбока аптымістычны. Ён імкнецца маляваць не толькі “нядолю” – *“уздыханні, што ходзяць з сахою, з сякерай, і холад, і голад”, “няволю”,* еле і долю-волю, *“і будучнасць ясну” “надзею і веру”* («Родныя песні»). Будучае Радзімы ён увасабляе ў вобразах Маладой Беларусі – дзяўчыны – вясны – світання [4, 118].

Такім чынам, імкненне да светлага ідэалу, лепшай долі, якая атаясамліваецца з воляй, жыццём без страху, звязваецца паэтам з вызваленнем ад векавога сну, пасіўнага чакання. Логіка купалаўскага вобраза Долі адметная агульнай скіраванасую на лепшае жыццё. Аналіз паэтычнага ўвасаблення вобраза Долі ў вершах Янкі Купалы сведчыць аб дастаткова высокай культуры сацыяльна-філасофскага мыслення творцы ў дарэвалюцыйны перыяд яго творчасці.

**Літаратура:**


1. Каваленка В. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. Мн., 1981.
2. Купала Я. Поўны збор твораў. У 9 т. Мн., 1995. Т. 1-4. 1995.
3. Навуменка І. Янка Купала // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. Кн.1. Мн., 1999.
4. Шамякіна Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія. Мн., 2001.